# БОСКАЯ НОТА Ў ПАЭЗІІ РЫГОРА БАРАДУЛІНА

*УА “Беларускі дзяржаўны медыцынскі універсітэт”*

*Байкова А.А., 2 к., 232 гр., ЛФ*

*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Навуковы кіраўнік – старэйшы выкладчык Ратынская Н.В.*

У чэрвені 2005 года ўбачыў свет зборнік духоўнай лірыкі Рыгора Барадуліна “Ксты”. Першая прэзентацыя кнігі адбылася ў Чырвоным касцёле, пасля чаго ксёндз Уладзіслаў Завальнюк вылучыў паэтычны зборнік Рыгора Барадуліна на Нобелеўскую прэмію.

Кніга “Ксты”, як зазначае аўтар, падрыхтавана была ўсім хрысціянскім жыццём паэта. У кнігу ўвайшлі духоўна-рэлігійныя творы, якія былі напісаны на мяжы XX – XXI стагоддзяў. Назва “Ксты” – ад слоў “крыж”, “хрысціцца”. У аснову ідэі кнігі пакладзена разуменне кожным ахрышчаным, што ён належыць да вялікай хрысціянскай сям’і. Выданне ў нашай айчыннай літаратуры духоўна-рэлігійнага зборніка паэзііі – з’ява новая. Трэба зазначыць, што вершы-малітвы за родны край, за сваю душу, вершы, прасякнутыя хрысціянскімі матывамі, былі заўсёды (зварот да Маці Божай Міколы Гусоўскага ў паэме “Песня пра зубра”, “Ахвяра” Францішка Багушэвіча, “Мая малітва” Янкі Купалы, “Магутны Божа, Валадар суветаў…” Наталлі Арсеньевай, творы Ларысы Геніюш, паэзія беларускай эміграцыі, вершы Дануты Бічэль-Загнетавай, Анатоля Вярцінскага, Васіля Зуёнка, сучасных маладых аўтараў). Не было іх толькі амаль ўсё XX стагоддзе, калі наўкол панаваў ваяўнічы атэізм.

На пачатку XXI стагоддзя духоўна-хрысціянская паэзія набывае шырокі размах. Напэўна, таму, што час дазваляе смела гаврыць пра Бога і пра сваю веру, што многія павярнуліся тварам да Храма, зразумеўшы, што месца рэлігіі ў духоўным жыцці грамадства нішто не можа замяніць. Вышай ідэалогіяй, якая дазваляе захаваць чалавечае ў чалавеку, заставалася і застаецца хрысціянства.

З’яўленне зборніка духоўнай паэзіі “Ксты” вельмі актуальнае, роздум над напісаным тут неабходны кожнаму, бо кожны чалавек радзей ці часцей звяртаецца да Бога ў думках або словамі малітвы. Зусім няверуючага чалавека няма на ўсёй зямлі, а непрактыкуючых, апушчаных, загубленых духоўна – мноства.

Зборнік “Ксты” складаецца з трынаццаці тэматычных частак (“Ружанец”, “Трыкірый”, “Бэтлеемам стане сэрца”, “Боская зорка”, “На ўскрайку вечнасці”, “З застрэшша мамінае хаты”, “Нябёсы думаюць аблокамі”, “Ноч мае форму яйка”, “Каб на зямлі жыццю цяплей было”, “Палыновая санеты”, “З лістоў да Васіля Быкава”, “ Укленчыць і прыпасці да рукі”, “Ахвярынкі”). Ніжэй будуць прааналізаваны некаторыя з іх.

1. Нацыянальны паэтычны ружанец



Рэпазіторый ГрДМУ

Першая частка зборніка "Ксты" называецца "Ружанец". Вядома, што без сапраўднай веры няма высокай маральнасці, а без апошняй – няма дэмакратычных пачаткаў у грамадстве, няма сацыяльнай справядлівасці, паразумення і еднасці паміж жыхарамі любой дзяржавы, няма стваральнага руху наперад.

2. Вобраз маці і Радзімы ў зборніку

Выключнасць мацярынскай ролі ў жыцці кожнага разумее і перадае ў сваім цыкле вершаў "З застрэшша мамінае хаты" верны і ўдзячны ёй сын Рыгор Барадулін.

Усё лепшае ў чалавеку, не раз сцвярджае паэт, ад Усявышняга і ад Маці:

Мы позіркам чыім
Глядзім на свет?
Хто ясніць нашай роспачы аблокі?
Пад зоркамі матуль
Нам відна ўсім.
Свет без сузор'я роднага бязвокі [3, с. 228].

Другой сапраўднай маці з'яўляецца для Рыгора Барадуліна, як і для кожнага чалавека, маці-Радзіма. Айчына, як і бацькі, адорвае нас шчодра духоўнай спадчынай: гісторыяй, традыцыямі, мовай, роднымі краявідамі. Любоў да ўсяго гэтага мы называем святым словам патрыятызм. Менавіта гэтая ўнутраная пазіцыя да Айчыны яскрава выяўляецца ў вершы "Беларусь – ты мой сон велікодны". [3, с. 269].

3. "Укленчыць і прыпасці да рукі"

У чэрвені 2004 года Рыгор Барадулін меў аўдыенцыю ў Папы Рамскага Яна Паўла ІІ. Яе паэт атрымаў пасля таго, як пераклаў на беларускую мову кнігу паэзіі Яна Паўла ІІ "Рымскі трыпціх". Святы айцец прымаў Рыгора Барадуліна не як перакладчыка, а як беларуса і як уніята.

Сваё Апостальскае блаславенне Папа ўдзяліў для ўсіх прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі, якія працуюць на развіццё беларускай хрысціянскай культуры, на адраджэнне Беларусі. Частка "Укленчыць і прыпасці да рукі" з'явілася як падзяка паэта Яну Паўлу ІІ за яго шчодрае сэрца.

Укленчыць і прыпасці да рукі,
Якая свет мудрэць добраслаўляе.
Адчуць, як ціхаміроцца вякі,
Як у душы зняможанай світае [3, с. 417].

4. "Пусці ў душу Хрыста…"

У цэнтры ўвагі раздзелаў "Трыкірый" і "Бэтлеемам стане сэрца" паэт хоча павесці нас следам вучэння Апостала Паўла, каб яшчэ раз наталіць свой розум і сэрца вялікай мудрасцю, каб мы сталі мудрымі ў сваёй дабрыні і каб "нікому нічога не былі вінныміі, апроч узаемнай любові". Перад намі паўстаюць біблейскія вобразы Ноя, Каіна, Апостала Пятра, Майсея, Адама і Евы, Марыі, здрадніка Юды, Понція Пілата і, безумоўна, Хрыста; прасціраюцца святы Ерусалім, Галілейскае мора,



Рэпазіторый ГрДМУ

Іардан, узвышаецца Сцяна Плачу. Вершы гэтых цыклаў прасякнуты прыгыжосцю навакольнага свету, якую дапамагае ўбачыць сіла талету Барадуліна.

5. Быць добрым у сваёй мудрасці

Цікава называе Рыгор Барадулін свой апошні паэтычны раздзел зборніка “Ахвярынкі”, які асацыіруецца са словам ахвяра, словам, без якога няма і слова хрысціянін. Бо толькі ахвярнае служэнне адзін аднаму, а не ўзвышэнне сябе над іншымі, ёсць гарантам спакою ў грамадстве, у сям’і, на працы, гарантам сапраўднай гуманнасці.

Раздзел складаецца ў асноўным з вершаў малой формы, якіх крыху больш за дзвесце: двухрадкоўяў, трохрадкоўяў, з рэдку чатырохрадкоўяў, аб’яднаных рыфмай. Кожны такі маленькі верш Рыгор Барадулін назваў арыгінальна – ахвярынка.

У сэрцы ні ўзімку, ні ўвесну
Богу й маме няцесна [3, с. 430].

Сумленне, як ласку матчыну,
Не купіш і ў складчыну [3, с.434].

Паэзія Барадуліна, увасобленая ў ахвярынках, – крыніца надзеі, якая ператвараецца ў раку спакою, што амывае кожнага высокай духоўнасцю, набліжае да ісціны.

Чалавек не памірае,
Зямныя адбыўшы дні,
Ён вяртаецца да цішыні. [3, с. 443].

“Ксты” Рыгора Барадуліна – гэта паэтычная беларуская Біблія, бо Боская нота гучыць непрыглушана ў кожным вершаваным радку. Хрысціянская паэзія – неабходны элемент нашай культуры. Яе пашырэнне акажа станоўчы ўплыў на духоўнае жыццё беларускага грамадства, стане для многіх патрэбнымі лекамі для душы, паспрыяе сапраўднаму адраджэнню краіны.

Спіс літаратуры

1. “Ave Maria”, № 8 – 9 (111 – 112) / 2004.
2. Барадулін, Р. Евангелле да Мамы / Р. Барадулін – Мінск: Маст. літ., 1995.
3. Барадулін, Р. Ксты: – Мінск: Рам. – катал. парафія св.Сымона і св.Алены, 2005.
4. ”Дыялог”, №1 (133) / 2006.
5. “Наша вера”, №2 (36) / 2006.
6. Рагойша, В. На шляху да Парнаса / В. Рагойша. – Мінск: Маст. літ., 2003.
7. “Роднае слова”.

Репозиторий ГрГМУ